Паляшчук А.А., г. Мазыр

# РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ПАЗНАВАЎЧАЙ АКТЫЎНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вызначаючы для сябе падыход да навучання беларускай мове і літаратуры, я правяла ў 2014/2015 навучальным годзе дыягностыку пазнаваўчай актыўнасці вучняў, якая паказала, што толькі 32% навучэнцаў цікавяцца прадметам беларуская мова і літаратура. Сапраўды, праблема прывіцця цікавасці да ведаў, фарміравання пазнаваўчай актыўнасці на ўроках беларускай мовы і літаратуры застаецца актуальнай. Мяне як настаўніка беларускай мовы и літаратуры хвалюе пытанне, як зрабіць урок больш яркім, цікавым, як стварыць на ўроку сітуацыю поспеху для кожнага вучня, як зацікавіць вучняў сваім прадметам, як павысіць якасць ведаў. Які сучасны настаўнік не марыць аб тым, каб дзеці на яго ўроку працавалі з цікавасцю, творча? Менавіта пагэтаму на кожным уроку, факультатыўным занятку, у пазакласнай дзейнасці я стараюся раскрыць і развіць творчыя здольнасці вучняў. Сваю задачу як педагога я бачу ў тым, каб супрацоўнічаць з вучнямі, выхоўваць у іх жаданне пошуку новых ведаў. Пачынаючы кожны ўрок, я думаю, як зрабіць, каб тыя веды, што прапаноўваюцца на ўроку, сталі трывалым набыткам вучняў. Асабліва неабходна творчасць у інтэлектуальнай дзейнасці школьнікаў. У іх фарміруецца фантазія, выдумка, арыгінальнасць, развіваецца інтуіцыя, прадбачанне, шырыня ведаў, уразлівасць, успрымальнасць. На ўроках беларускай мовы і літаратуры я выкарыстоўваю наступныя метады і прыёмы:

1) Ілюстрацыя фразеалагізмаў, прыказак і прымавак.

Гэты прыём я прымяняю не толькі на ўроках тлумачэння новага матэрыялу, але і як моўную хвілінку на ўроках для развіцця маўлення вучняў, і пры вывучэнні іншых тэм. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы

“Займеннік як часціна мовы” вучні павінны адгадаць прыказкі, у якіх ужываюцца займеннікі, і вызначыць разрад займеннікаў, іх склон і сінтаксічную ролю:

У вераб'я багатая сям'я: у **кожнага** верабейкі па тры капейкі.

**Я яму** пра абразы, а **ён мне** пра гарбузы.

Не **маё** гарыць - не **мне** тушыць.

**Які** пастух, **такая** й чарада.(Дадатак 1)

Пры вывучэнні тэмы “Знакі прыпынку пры параўнальным звароце” я выкарыстоўваю ілюстрацыі да фразеалагізмаў, якія пачынаюцца са злучніка <u>як</u> і коскамі не выдзяляюцца:

Біцца <u>як</u> рыба аб лёд. Патрэбен <u>як</u> рыбе парасон. <u>Як</u> снег на галаву. <u>Як</u> сабаку пятая нага. <u>Як</u> віламі па вадзе. (Дадатак 2)

2) Пераклад вершаў з рускай мовы на беларускую, зберагаючы рытм і рыфму.

Напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Дзеяслоў як часціна мовы” я прапаноўвала вучням вершы мазырскіх паэтаў пра наш родны горад. Адно з заданняў было – перакласці верш А.Фролікава “Песня о Мозыре” на беларускую мову.

Арыгінал

*В краю родном, в краю полесском,*

*Где Припять вольной течёт рекой,*

*Стоит мой город любимый с детства,*

*Чудесный город – Мозырь мой.*

*В час испытаний в бою с врагами,*

*Как исполин, он насмерть стоял.*

*Весь был изранен на поле брани,*

*Мой город-воин всё ж выстоял.*

Пераклад

У краі родным, краі палескім,

Дзе Прыпяць вольнай цячэ ракой,

Стаіць мой горад, з дзяцінства блізкі,

Цудоўны горад – Мазыр мой.

У цяжкі час выпрабаванняў,

Як іспалін, на смерць стаяў.

Ён быў паранены на полі брані.

Ваенны горад усё ж выстаяў.

Выкарыстоўваючы гэты метад на ўроках, у мяне сабралася творчая капілка перакладаў вучняў, з якімі яны прымаюць удзел у розных конкурсах. Напрыклад, у конкурсе перакладаў вершаў Уладзіміра Высоцкага мая вучаніца Ганчарэнка Хрысціна атрымала дыплом 1 ступені за пераклад верша “Дайте собакам мяса”:

Дайце сабакам мяса –

Можа, яны пагрызуцца!

П’яніцам – хмельнага квасу.

Можа, яны перап’юцца.

Зерне ў зямлю схаронім –

Можа, мы з хлебам будзем.

Каб не сыцець варонам,

Болей расстаўце пудзіл.

Трэба кахаць – каханым,

Дайце хоць кут на абодвух.

Добра, я буду рахманым –

Дайце ж вы мне свабоду!

Псам мясныя аб'едкі

Кінулі – псы не грызуцца.

П'яніцам далі гарэлкі, -

Тыя не п'юць, смяюцца.

Людзі варон пужаюць,

А вараннё не баіцца.

Пары злучаць, - злучаюць,

А ім бы – каб  разлучыцца,

А зерня не вышлі сходы!

Што за такія цуды?!

Далі мне ўчора свабоду…

Што я рабіць з ёй буду?

3) Спробы самастойнага складання вершаў, баек, казак, апавяданняў.

Пры падрыхтоўцы  адораных вучняў да алімпіяды і творчых конкурсаў  я заўсёды прапаную падобныя заданні. Працу над складаннем уласных твораў я пачынаю ў 5 класе, прапануючы на ўроках заданні тыпу 1) падбор рыфмы да слоў; 2) складанне лінгвістычнай казкі; 3) стварэнне і разгадванне цэнтону і г.д. У старэйшых класах некаторыя вучні ўжо гатовы складаць самастойныя творы,

якія друкуюцца ў школьнай або мясцовай газеце, прымаюць удзел у розных конкурсах. Напрыклад, верш Падалінскай Аляксандры “Настаўніку” быў напісаны для ўдзелу ў конкурсе “Пасланне настаўніку”:

Ты вучыш нас любіць,

Ты вучыш нас цярпенню,

Жаданню жыць, смяяцца і цаніць

Жыццё і кожнае імгненне,

І чалавекам па жыцці сапраўдным быць.

Як часта так бывае, што не можам

Мы гэтай ролі добра ацаніць

І панапрасну мы настаўніка трывожым

Замест таго, каб “дзякуй” гаварыць.

Твае ўрокі ўспомнім неаднойчы,

Калі мы пойдзем у дарослае жыццё,

І ў яго ўпэўнена пакрочым,

Праблемы тут жа кануць у небыццё.

Ты па дарозе ведаў крочыш смела

І сэрцам дакранаешся да нашых душ.

А мы любоў сваю паказваем няўмела.

Ты толькі гэтай сувязі не руш!

Павер, мы ўсёй душою ганарымся,

Удзячнасць пранясём мы ў мальбе,

І нізка да зямлі мы пакланімся,

Настаўнік паважаны наш, Табе!

4) Стварэнне пакадравага ілюстрацыйнага плана.

Гэты прыём я выкарыстоўваю на ўроках беларускай літаратуры. Напрыклад, пры вывучэнні апавядання Змітрака Бядулі “На Каляды к сыну”. (Дадатак 3). З такіх пакадравых ілюстрацый мы з вучнямі складаем папулярныя зараз буктрэйлеры па казках, легендах, міфах, прыказках, загадках. Гэтыя відэаролікі асабліва цікавыя для вучняў 5-8 класаў.

5) Рэклама кнігі, беларускай мовы, фільмаў, экранізаваных па творах беларускіх пісьменнікаў.

Асабліва цікавым вучням падаецца заданне прыдумаць рэкламу беларускай мовы. Яны ствараюць відэаролікі, у якіх заклікаюць беларусаў не забываць, а любіць і паважаць родную мову; прыдумваюць рэкламныя слоганы; робяць цікавыя ілюстрацыі. (Дадатак 4)

6) Складанне зборнікаў на пэўную тэму.

Часцей за ўсё я прымяняю такі від работы на ўроках беларускай літаратуры ў 8 класе. Вучні складаюць зборнікі вершаў розных відаў лірыкі. Але скласці падобны зборнік можна прапанаваць і вучням 5 класаў пры вывучэнні вуснай народнай творчасці. У яго будуць уваходзіць прыказкі, прымаўкі, загадкі на пэўную тэму, народныя прыкметы, казкі, ілюстрацыі. У 9 класе пры вывучэнні тэмы “Цытаты, афармленне на пісьме” я прапаную скласці зборнік афарызмаў на пэўную тэму або выказванняў пісьменніка-юбіляра. У 10 класе пры вывучэнні твораў перыяду Вялікай Айчыннай вайны вучні складаюць зборнік вершаў на ваенную тэму, у 11 класе - “Зборнік твораў сучасных беларускіх пісьменнікаў”. (Дадатак 5)

7) Вусныя выказванні на пэўную тэму з выкарыстаннем мультымедыйных прэзентацый.

Напрыклад, “Шануйце братоў нашых меншых», «Спорт у Беларусі», «Не праходзьце міма чужой бяды», «Маці», «Беларусь – краіна высокіх тэхналогій», “Мінск – сталіца Беларусі” і г.д. Гэтыя прэзентацыі я выкарыстоўваю пры падрыхтоўцы да вуснага выказвання на алімпіяду па беларускай мове і літаратуры, на класных гадзінах, на ўроках беларускай мовы для развіцця маўлення вучняў. На медыяўроку мяняецца роля настаўніка: педагог часцей за ўсё выступае ў якасці кансультанта і можа адвесці на індывідуальную работу з вучнямі больш часу. Такама ёсць унікальная магчымасць зрабіць урокі роднай мовы і літаратуры больш цікавымі, наглядньмі і дынамічнымі.

8) Так, для стварэння эмацыянальнага настрою ў прэзентацыях я выкарыстоўваю анімацыю.

Напрыклад, анімацыйныя загадкі - для замацавання арфаграфічных навыкаў, анімацыйныя віктарыны - для укараненння тэарэтычных ведаў, анімацыйныя фізкультхвілінкі – для эмацыйнага настрою на ўроках. Мультымедыяўрок не патрабуе вялікіх намаганняў ад настаўніка, а дапамагае адводзіць час на індывідуальную працу з вучнямі, робіць урок больш цікавым, наглядным, запамінальным.

8) Альтэрнатыва прэзентацыям – відэаролікі, створаныя настаўнікам ці самімі вучнямі.

Так вучні старэйшых класаў складалі відэаролікі па наступных тэмах: “Беларуская культура 20 стагоддзя”, “Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны”, “Экранізацыі твораў Васіля Быкава”, “Святкаванне Купалля”, “Свята Каляды”, “Жыццёвы і творчы шлях Максіма Танка”, “Чарнобыльская трагедыя” – пры вывучэнні ў 11 класе на ўроку беларускай літаратуры сучаснай прозы, “Хатынь” – пры вывучэнні аповесці Алеся Адамовіча “Хатынская аповесць” і дакументальнай аповесці “Мы з вогненнай вёскі”, “Топ-10 папулярных прафесій у Беларусі” пры вывучэнні тэмы “Падагульненне вывучанага па тэме “Складаназлучаны сказ” у 9 класе.

9) Выраб наглядных дапаможнікаў вучнямі.

а) Вучням старэйшых класаў я прапаную стварэнне відэаролікаў па песнях на словы беларускіх паэтаў. Мэтазгодна выкарыстоўваць такія відэа на ўроках беларускай літаратуры пры вывучэнні лірыкі: “Спадчына” Янкі Купалы, “Завушніцы” Максіма Танка, “Той дзень прапаў і страчаны навекі” Пімена Панчанкі, “Мой родны кут” Янкі Купалы, “Беларускія партызаны”, “Крэпасць над Бугам”, “Дарагая Беларусь” Петруся Броўкі, “Родная мова” Максіма Танка, “Пахне чабор” Петруся Броўкі (мікс з песень на верш П.Броўкі).

б) Стварэнне прзентацый для нагляднага суправаджэння адказу вучня на ўроку. Асабліва часта гэты метад прымяняецца на ўроках беларускай літаратуры пры прадстаўленні дакладаў (прэзентацыі па тэмах “Культура і літаратура эпохі Адраджэння”, “Выраб слуцкіх паясоў”, “Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа”, “Сучасная беларуская паэзія і г.д.). (Дадатак 6)

Аналіз педагагічнага і псіхалагічнага вопыту, праведзены мною, вынікі работы (працэнт вучняў, зацікаўленых прадметам беларуская мова і літаратура, павысіўся да 73) служаць падставай для працягу работы ў гэтым накірунку. Апісаная ў рабоце сістэма была прадэманстравана на пасяджэннях раённага метадычнага аб’яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, на раённых пасяджэннях клуба “Педагог года”, на адкрытых уроках і раённых семінарах, на сайце раённага аддзела адукацыі, у перыядычным друку. Інфармацыя будзе карысна настаўнікам беларускай мовы і літаратуры. Актуальнасць дадзенай работы вельмі высокая, бо ў метадычных рэкамендацыях “Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” прапісана патрабаванне пашырэння сферы выкарыстання і папулярызацыі беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, павышэння якасці навучання беларускай мове і літаратуры.

**Дадатак 1**









**Дадатак 2**










**Дадатак 3**



**Дадатак 4**












**Дадатак 5**




**Дадатак 6**

